# Паміж Цной і Камароўкай

Інфармацыйны бюлетэнь кааліцыйных дэмакратычных сіл Савецкага раёна • № 5 (2) • красавік 2007

## Шанцаў усынавіць беларускае дзіця замежнікі амаль ня маюць.

**У Беларусі 32 тысячы дзяцей-сірот, зь іх 8842 выхоўваюцца ў дзіцячых дамах і інтэрнатах. Летась беларускія сем'і ўсынавілі 337 дзяцей, а замежныя — толькі 37 беларускіх дзетак. Штогоду працэдура міжнароднага ўсынаўленьня ўскладняецца. Днямі Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытаньні зьмены й дапаўненьні ў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс, якія тычацца ўсынаўленьня беларускіх дзяцей.**

Цяпер іншаземцы могуць усынавіць беларускае дзіця толькі пасьля пісьмовага дазволу міністра адукацыі, якое трэба падаць у суд.

Да гэтага пытаньне аб міжнародным усынаўленьні месяц разглядалі ў мясцовых органах апекі, потым пятнаццаць дзён у Нацыянальным цэнтры ўсынаўленьня.

Пабольшала і колькасьць дакумэнтаў для міжнароднага ўсынаўленьня. Цяпер патрэбнае заключэньне Нацыянальнага цэнтру ўсынаўленьня пра тое, што беларускія грамадзяне і сваякі не прэтэндуюць на ўсынаўленьне дзіцяці.

Павінен быць і дакумэнт з датай пастаноўкі на ўлік у цэнтралізаваным банку зьвестак. Гэта пацьвердзіць, што дзіця ня менш за год было даступнае для ўладкаваньня ў сям'ю ў нашай краіне.

Нават на стадыі абмеркаваньня такія ўскладненьні выклікалі рэзкую крытыку дэпутатаў.

Меркаваньне Івана Семянені:

"Ад загадчыка РАНА, ад настаўніцы, ад старшыні камісіі да міністра трэба падпісаць, ды яшчэ судом застрахавацца. Гэта такая складаная працэдура, што людзі папросту ня могуць прайсьці яе. Гэта фізічна немагчыма.

Закон ідзе на ўскладненьне працэдуры ня толькі міжнароднага ўсынаўленьня, але і ў сябе дома".

Дэпутат Аляксандар Шацько сказаў:

"На сёньняшні момант уся гэтая схема, якую вы распрацавалі, ня толькі не працуе — яна спыняе ўсё магчымае, добрае, што ёсьць у працэсе ўсынаўленьня".



У 2003 годзе замежнікі ўсынавілі 714 беларускіх дзяцей, у 2004-м — 539. Летась разгледзелі 150 заяваў замежных грамадзянаў, задаволілі толькі трыццаць дзевяць.

Трыццаць сем дзяцей трапілі ў італьянскія сем'і, адно дзіця — у швэдзкую, адно — у расейскую сям'ю.

З пачатку 2007 году толькі чатырох беларускіх малых усынавілі іншаземцы.

Як паказала практыка, 75% дзяцей, якіх усынавілі замежнікі, маюць хранічныя захворваньні, інваліднасьць, асаблівасьці псыхафізычнага разьвіцьця. Такіх дзяцей беларусы не забіраюць.

За ўсю гісторыю міжнароднага ўсынаўленьня былі толькі два выпадкі, калі дзеці не засталіся ў прыёмных сем'ях за мяжой, апавяла намесьніца міністра адукацыі Тацяна Кавалёва:

"Адзін выпадак адбыўся ў Швэцыі, дзе сацыяльныя службы выкрылі жорсткае абыходжаньне зь дзіцёнкам. Вельмі хутка гэтае дзіця ўсынавілі іншыя людзі.

І быў выпадак у ЗША, калі хлопчык дасягнуў падлеткавага веку і сам выказаў жаданьне вярнуцца. Сказаў, што ён ня хоча там заставацца, і паводле ўзгадненьня зь сям'ёй зьехаў на радзіму".

На вясновой сэсіі парлямэнту законапраект аб усынаўленьні разгледзяць у другім чытаньні. З аднаго боку, выглядае, што дзяржава клапоціцца пра дзяцей: часткова праблема сіроцтва вырашаецца коштам апякунскіх сем'яў, дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, SOS-дзіцячых вёсак.

Але 8842 дзіцяці застаюцца ў дзіцячых дамах і інтэрнатах. Складваецца ўражаньне, што чыноўнікі лічаць: беларускім дзецям лепш у айчынным дзіцячым доме, чым у сям'і за мяжой.

**Іна Студзінская, svaboda.org**

## Савецкі раён для дзяцей.

**У Савецкім раёне знаходзіцца інтэрнат №4 па вуліцы Берасцянская 20. "Паміж Цной і Камароўкай" разам з вамі дапаможа дзецям з гэтага інтэрната зрабіць іх дзяцінства ярчэй і цяплей. Просім адазвацца добрых людзей на гора гэтых дзетак і дапамагчы нам зрабіць гасцінец інтэрнату на дзень абароны дзяцей. Больш падрабязная інфармацыя ў Інтэрнэце www.kamarouka.org. Свае пажаданні і сказы дасылайце нам на e-mail: kamarouka@gmail.com або па тэлефону +375299029516.**

**Такім чынам, мы пачынаем праект пад назвай "Савецкі раён для дзяцей".**

## Минск отметит 940-летие

Без прошлого не бывает будущего. Именно поэтому сегодня, когда наш прекрасный город готовится встретить юбилей, мы еще и еще раз обращаемся к его истории, всматриваемся в старые фотографии, картины и рисунки, с которых смотрит на нас Минск ушедший

Увы, далеко не все построенное предками дожило до наших дней. Многочисленные войны и пожары, бездумное устранение памятников архитектуры лишило нас возможности видеть город таким, каким он был раньше. К счастью, что-то из утраченного возвращается: нынче мы снова можем любоваться ратушей, воссозданной красавицей «Европой», отреставрированными домами исторического центра Минска...

Когда здесь, в Верхнем городе, звонят колокола, невозможно оставаться равнодушным. Сколько поколений предков слушали этот звон, молились в здешних храмах, крестили детей и венчались, радовались и горевали. Эти храмы строились десятилетиями и на века, но иногда уничтожались в один день. Такая печальная участь постигла многие из святынь, независимо от их конфессиональной принадлежности. Среди них - костел и комплекс монастырей доминиканцев и униатская церковь Святого Духа.

**Андрей Воля**

**Мы ў Інтэрнэце:**

*гарачая лінія*

*+375299029516*

***# Форум***

***# Навіны***

***# Абмеркаванне артыкулаў***

***# Вашыя пытанні, падзякі***

**Дасылайце вашыя артыкулы на kamarouka@gmail.com і мы іх надрукуем**

**www.kamarouka.org**

## Студэнтам, інвалідам і ліквідатарам наступстваў аварыі на ЧАЭС збіраюцца скасаваць ільготы

**Зніжкі на праезд для студэнтаў ды навучэнцаў і на лекі малым да трох гадоў урад палічыў "лішнімі". Законапраект пра скасаванне ільготаў падрыхтаваны Радай Міністраў і будзе канчаткова вырашаны Палатай Прадстаўнікоў у канцы наступнага месяца. Зрэшты, да таго часу дэпутаты альбо прадстаўнікі грамадскіх арганізацыяў змогуць адстаяць некаторыя з ільготаў. 12 красавіка Лукашэнка на прэс-канферэнцыі сказаў наступнае: *"Что касается проекта закона и реакции населения, которые сейчас обсуждаются в парламенте, еще прошлый парламент должен был принять этот закон. И обсуждать нечего. Это льготы, которые уже сегодня моим решением не действуют. Их надо просто сегодня внести в закон, поправить закон. Но это было не популярно перед выборами. Тогда я пошел навстречу парламентариям, не стал заставлять правительство регулировать эти вопросы."***

Навучэнцаў і студэнтаў-вочнікаў збіраюцца пазбавіць 50% зніжкі на праезд унутры краіны з 1 кастрычніка па 30 чэрвеня ў суботы, нядзелі й святы. Ня змогуць яны паехаць дахаты й зімовымі канікуламі. Права на 50% паездку па краіне мяркуюць пазбавіць і дзяцей-інвалідаў. Апрача таго, плануюць болей не плаціць штогадовую грашовую кампенсацыю на транспартныя выдаткі дзецям, хворым на тэрмінальную стадыю хранічнай ныркавай нядатнасці.

Міністар адукацыі А. Радзькоў 18 красавіка 2007 г. прамовіў шчырую хлусню датычна студэнцкіх ільготаў на праезд у грамадзкім транспарце: "З аднаго боку, у нас заўжды былі ільготы на праезд для студэнтаў, і мы прызвычаіліся да гэтага. З іншага боку, анідзе ў свеце гэта не пашырана".

Тымчасам, у краінах Еўразвязу студэнцкія льготы напраўду йснуюць ды сфера іх дзейнасці куды шырэйшая за беларускую. Уладальнікі студэнцкіх білетаў у Польшчы, Літве ці Нямеччыне маюць зніжкі на праезд у гарадзкім транспарце і праезд па краіне ў пэўныя дні, на мэдычнае страхаванне, наведанне музеяў, тэатраў. Болей за тое, маюць яны й зарукі іншага тыпу, напрыклад, зніжэнне кошту на камунальныя паслугі, кватэры і інш. Ды й у суседняй Украіне студэнты-вочнікі плацяць палову за праезд унутры рэспублікі штодня ў перыяд навучальнага году, у працоўныя дні таксама. Нашыя ж ня круглы год ды толькі на святы. Цяпер і гэта забраць пагражаюць.

Зрэшты, можна дараваць нявыезнаму чыгоўніку ягоную фразу. Свет яму, пэўна, уяўляецца і абмяжоўваецца адно сяброўскімі Паўночнай Карэяй, Кубай і Венесуэлай.

Ліквідатарам аварыі на ЧАЭС ільготны праезд, 50% зніжка на камунальныя паслугі былі раней скасаваныя загадам прэзідэнта. Асталіся толькі санаторна-курортнае лячэнне, бясплатныя лекі і дадатковы водпуск. Цяпер ліквідатары могуць пазбавіцца іх таксама.

Ініцыятар стварэння Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднання "Ліквідатар" А. Ваўчанін знамерыўся зыніцыяваць збор подпісаў пад зваротам да Лукашнкі з патрабаваннем захаваць ільготы удзельнікам ліквідацыі аварыі на ЧАЭС. ¨н спадзяецца працістаяць прыняццю пастановы праз кансалідацыю ліквідатараў, якіх у краіне ля 115 тыс. , і просіць зацікаўленых звязвацца з ім па тэл. 8-029-762-8744.

Відавочна, што студэнты й малыя дужа парэжуць бацькоўскі бюджэт. Падлічым, колькі, скажам, студэнту з Мазыру, што вучыцца ў Менску, абыдзецца зьездзіць дахаты й назад на поўны кошт. Паводле сённяшніх расцэнак, ехаўшы звычайнай маршруткай,- каля 48 тыс. рублёў, экспрэс-маршруткай 66 тыс., найтаннейшым цягніком (Баранавічы-Жытомір, з улікам начной бялізны) каля 42 тыс. Тымчасам паводле пастановы Рады Міністраў РБ ад 30.01.2007 №110 патрэбны мінімум студэнту складае 180020 рублёў, працаздольнаму грамадзяніну 188790, а ў структуры бюджэта на чалавека "бытавыя і транспартныя паслугі" складаюць 7,7%, то бок 13860 рублёў. Дык поўны месячны праязны на метро каштуе болей за 20000 тыс.! На што жыць і для каго пішуць гэтыя лічбы?

Вось такія крокі ў "сацыяльна арыентаванай краіне", дзе "дзяржава для народа"!

**Гудовіч Андрэй**